# СА СВЯТАМ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ!




ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 16 (540) | Субота, 7 мая 1983 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.


## ПРЫСВЕЧАНАЕ ДНЮ ПЕРАМОГІ

Учора ў актавай зале універсітэта адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае 38-ай гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. З дакладам вуступіў намеснік сакратара парткома У. Д. Арэшчанка.

Быў зачытан загад па універсітэту, у якім рэктар акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць павіншаваў калектыў ГДУ са знамянальным святам.

На вечары са святочным канцэртам выступілі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці факультэта фізвыхавання.

## ПЕРШАМАЙСКІЯ ЎРАЧЫСТАСЦІ

З прыўзнятым настроем, з пачуццём радасці і гонару за нашу неабсяжную шматнацыянальную Радзіму калектыў універсітэта, як і ўсе савецкія людзі, сустрэў Першамайскае свята — дзень Міжнароднай салідарнасці працоўных усяго свету.

30 красавіка ў актавай зале адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны святу вясны і працы. З дакладам на ім выступіў старшыня прафкома М. Н. Мурашка.

Начальнік аддзела кадраў П. А. Савінскі зачытаў загад па універсітэту, у якім рэктар ГДУ павіншаваў выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і аспірантаў са знамянальным святам, пажадаў ім новых поспехаў у працы, навукова-педагагічнай дзейнасці і вучобе.

1 Мая калектыў універсітэта прыняў удзел у гарадской дэманстрацыі. У гэты дзень надвор'е не парадавала, Аднак, як заўжды, калоны дэманстрантаў былі мнагалікімі. Праходзячы па цэнтральнай плошчы, якая носіць імя дарагога ўсім нам Уладзіміра Ільіча Леніна, прадстаўнікі вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся рапартавалі любімай Айчыне, роднай Камуністычнай партыі, свайму народу аб дасягнутых поспехах, аб агульным імкненні дамагацца яшчэ большых вынікаў ва ўсіх справах.

## ПАМЯЦЬ ПРА НАРОДНЫ ПОДЗВІГ

38-ы раз савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва будуць адзначаць вялікае свята Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. 38 гадоў жывём мы ва ўмовах міру. Даўно залечаны цяжкія раны, нанесеныя нашай краіне, народу жорсткай вайной, вырасла пакаленне, якое не ведае яе жахаў. Але чым болей аддаляе нас час ад гераічных падзей Вялікай Айчыннай вайны, тым больш велічнай паўстае перад намі вялікая Перамога. Жыве і вечна будзе жыць у сэрцах савецкіх людзей памяць пра народны подзвіг. Гарыць Вечны агонь на братніх магілах, высечаны на мармуры абеліскаў імёны тых, хто аддаў жыццё за наш сённяшні шчаслівы дзень.

Цяжкім і доўгім быў шлях да перамогі. 1418 дзён і начэй у рашучых бітвах з ворагам кавалася нялёгкая перамога, і заваявана яна вельмі дарагой цаной! 20 мільёнаў лепшых сыноў і дачок аддалі свае жыццё за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. Таму цяпер маладое пакаленне краіны бачыць свой асноўны патрыятычны абавязак у тым, каб увекавечыць подзвіг герояў, акружыць цеплынёй і клопатамі ветэранаў, сем'і загінуўшых.

Вялікая ваенна-патрыятычная работа ў гэтым напрамку праводзіцца ў нашым універсітэце. Камсамольцы, студэнцкая моладзь прымаюць актыўны ўдзел у правядзенні Усесаюзнай вахты памяці. Гэта важная героіка-патрыятычная акцыя праходзіць у краіне з 3 па 9 мая і з'яўляецца адным з этапаў падрыхтоўкі да святкавання 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Прадумана і мэтанакіравана будуюць работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнцкай моладзі камітэт камсамола універсітэта, камсамольскія бюро факультэтаў. Асабліва добра пастаўлена гэта работа на гісторыка-філалагічным, эканамічным, матэматычным і фізічным факультэтах. Тут ужо стала добрай традыцыяй у дні Вахты памяці праводзіць цікавыя сустрэчы з удзельнікамі вайны, папаўняць рады ўдзельнікаў Усесаюзнага пахода па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Актыўна вядзецца прапаганда ленінскага вучэння аб абароне сацыялістычнай Айчыны, працягваецца напісанне летапісу баявой і працоўнай славы Цэнтральнага раёна, праведзены мітынгі ў абарону міру, іншыя мерапрыемствы.

Звыш 50 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія на розных франтах, у партызанскіх атрадах змагаліся за свабоду і незалежнасць Радзімы, працуюць у ГДУ. І цяпер, як і ў грозныя гады вайны, яны застаюцца прыкладам для моладзі па добрасумленнаму выкананню свайго грамадзянскага абавязку. Частымі гасцямі ў маладзёжных калектывах, у студэнцкіх аўдыторыях і інтэрнатах з'яўляюцца выкладчыкі універсітэта А. А. Баскакаў, Г. С. Мільчанка, П. А. Дуброўскі, І. А. Ільіных, Г. С. Еўдакіменка, Я. Р. Ермалаеў, Я. А. Семянчук, А. А. Касцікаў, У. В. Анічэнка, У. Д. Арэшчанка, М. П. Шкарбун, В. А. Хількевіч, М. І. Рубцоў, Д. А. Лявончанка, У. С. Сідараў, П. У. Жукаў, А. С. Калугін і многія іншыя.

Напярэдадні свята вялікай Перамогі былыя франтавікі і партызаны па добрай традыцыі зноў пабывалі ў многіх студэнцкіх групах. Яны дзяліліся сваімі ўспамінамі аб суровых выпрабаваннях у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, расказвалі пра гераічныя подзвігі таварышаў па зброі.

38-ю гадавіну Вялікай Перамогі савецкія людзі адзначаюць у абстаноўцы ўсенароднага палітычнага і працоўнага ўздыму, выкліканага гістарычнымі рашэннямі XXVI з'езда КПСС, лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС. Па ўсёй краіне шырыцца барацьба за ажыццяўленне іх рашэнняў, паспяховае выкананне заданняў 11-й пяцігодкі.

Актыўны ўдзел ва ўмацаванні эканамічнай і абароннай магутнасці Радзімы — наш лепшы ўклад у справу захавання міру на зямлі.

**У. КОЎШ,**
**старшыня камітэта ДТСААФ ГДУ, маёр запасу.**

## СЁННЯ — ДЗЕНЬ РАДЫЁ

7 МАЯ 1895 года выдатны рускі вучоны Аляксандр Сцяпанавіч Папоў прадэманстраваў першае ў свеце радыёпрыёмнае прыстасаванне. Так быў пакладзены пачатак развіццю радыётэхнікі, велізарная роля якой з кожным годам становіцца ўсё больш відавочнай. Радыётэхніка хутка ўдасканальваецца. Прайшло не шмат часу, і яна авалодала перадачай не толькі гукаў, але і адлюстраванняў.

З нетраў радыётэхнікі ўзнікла радыёэлектроніка. Яна ахоплівае тэорыю і практыку як радыётэхнічных, так і электронных прыстасаванняў і прыбораў, прымяненне якіх можа адбывацца і без удзелу радыё, г. зн. без радыёхваль.

Радыёэлектроніка яшчэ маладая, але яе роля і значэнне ў нашыя дні велізарныя. Перадавы край сучаснага прагрэсу навуковых і тэхнічных ведаў вызначаецца дасягненнямі радыёэлектронікі. Калі б не яна, дык у космас не праніклі магутныя ракеты. Паветраныя лайнеры не здолелі б перасякаць акіяны. Не было б ні радыёвяшчання, тэлебачання, ні атамных электрастанцый і караблёў, звышхуткіх вылічальных машын і электронных мікраскопаў, ні радыётэлескопаў і сінхрафазатронаў, а таксама многага іншага. Чалавецтва апынулася б адкінутым у шэрагу адносін у мінулае стагоддзе.

У цяперашні час удалося выканаць адну з цяжэйшых тэхнічных задач — забяспечыць перадачы Цэнтральнага тэлебачання на велізарныя тэрыторыі нашай краіны, якая працягнулася праз адзінаццаць гадзінных паясоў.

За прайшоўшыя гады ў краіне праведзена вялікая работа па стварэнню адзінай аўтаматызаванай сеткі краіны — ЕАСС. На базе лічбавых сістэм перадачы і электронных камунітацыйных прыстасаванняў будуць ствараццa інтэгральныя лічбавыя сеткі сувязі. Асваенне новых дыяпазонаў частот, сістэм спадарожнікавай сувязі з вузканакіраванымі антэнамі і апрацоўкай сігналаў на борце — вось толькі асобныя з праблем, якія патрэбна яшчэ вырашыць.

Далейшае развіццё і ўдасканальванне радыёэлектронных сродкаў рознага прызначэння пойдзе па напрамку максімальнай замены механічных вузлоў і блокаў электроннымі; шырокага ўкаранення лічбавай тэхнікі для перадачы, захавання і апрацоўкі інфармацыі; выкарыстання вялікіх і звышвялікіх інтэгральных схем, у асаблівасці мікрапрацэсараў; распрацоўкі і апрацоўкі сігналаў, заснаваных на дасягненнях акустаэлектронікі, оптаэлектронікі, магнітаэлектронікі і г. д.

Можна чакаць, што дзякуючы выкарыстанню шэрагу новых фізічных эфектаў, з'явяцца новыя радыёсістэмы і кампаненты вылічальнай тэхнікі, якія можна будзе параўнаць з такімі біялагічнымі сістэмамі, як чалавечы мозг.

Дзень радыё — свята навукі, радыёэлектронікі, радыёвяшчання, тэлебачання, сувязі, радыёаматарства.

Калектыў фізічнага факультэта ГДУ сустрэў гэта свята новымі творчымі поспехамі. Толькі за мінулы год пададзена у Камітэт па справах адкрыццяў і вынаходніцтваў 35 заявак на мяркуемыя вынаходніцтвы, і ўжо атрымана 11 станоўчых рашэнняў. Пры нашай кафедры радыёфізікі паспяхова працуе галіновая навукова-даследчая лабараторыя

**М. БАРАНАЎ,**
**асістэнт кафедры радыёфізікі.**

# НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

Учора завяршылася абласная міжвузаўская канферэнцыя «Фарміраванне навуковага светапогляду студэнтаў у вучэбным працэсе».

Канферэнцыя прысвячалася 165-годдзю з дня нараджэння і 100-годдзю з дня смерці заснавальніка навуковага камунізму К. Маркса і пачалася з пленарнага пасяджэння. Уступным словам яго адкрыў загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў абкома КПБ Б. М. Збароўскі. Затым было заслухана пяць дакладаў. Старшыня савета рэктараў г. Гомеля рэктар БелІІЧТу прафесар П .А. Сыцко выступіў з дакладам «Аб задачах удасканальвання светапогледавай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў у святле патрабаванняў XXVI з'езда КПСС і лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС.

Два даклады было зроблена вучонымі нашага універсітэта: рэктарам, акадэмікам АН БССР Б. В. Бокуцем — «Фарміраванне светапогляду студэнтаў у працэсе выкладання прыродазнаўчых навук», членам-карэспандэнтам АПН СССР, загадчыкам кафедры педагогікі і псіхалогіі І. Ф. Харламавым — «Аб дзейным падыходзе да фарміравання камуністычнага светапогляду студэнтаў».

Пасля пленарнага пасяджэння канферэнцыя працягвала работу ў дванаццаці секцыях, якія аб'ядноўвалі адпаведна грамадскія і гуманітарныя, прыродазнаўчыя і тэхнічныя навукі. З дакладамі на іх ад нашага універсітэта выступіла каля 25 чалавек.

# ПЕРШЫМІ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

З мэтай павышэння палітычнай сталасці студэнтаў камітэт камсамола універсітэта рэкамендаваў увесці ў праграму грамадска-палітычнай атэстацыі ўдзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС— у жыццё!» палітычны залік. Гэта адна з форм сумеснай дзейнасці камсамольскай арганізацыі і кафедр грамадскіх навук па камуністычнаму выхаванню моладзі.

Ва універсітэце першымі правялі палітычны залік камсамольцы нашай групы Б-11 біялагічнага факультэта. Перад гэтым усе ўважліва азнаёміліся з асноўнымі патрабаваннямі палітзаліку, разам з куратарам групы дацэнтам кафедры батанікі і фізіялогіі раслін А. М. Баравіковай, кандыдатам гістарычных навук з кафедры гісторыі КПСС У. П. Ксянзовым распрацавалі пытанні да яго.

Кожны камсамолец падышоў да новай справы з пачуццём адказнасці, таму палітычны залік прайшоў ў групе на высокім арганізацыйным узроўні. У ходзе заліку ўсе студэнты групы давалі грунтоўныя і вычарпальныя адказы на зададзеныя пытанні аб палітычным жыцці СССР, з лёгкасцю маглі паказаць на карце тую ці іншую краіну, даць характарыстыку яе эканамічнага і палітычнага жыцця.

Камсамольцы групы запрасілі на правядзенне палітычнага заліку сакратара камітэта камсамола універсітэта С. У. Аўсеенку. Ён выступіў перад студэнтамі, даў станоўчую ацэнку праведзенаму мерапрыемству.

Магчыма, яшчэ не ўсё мы змаглі зрабіць так, як нам таго хацелася б. Але ў нас яшчэ ўсё наперадзе, і мы пастараемся ў далейшым весці работу ў нашай групе так, каб студэнцкае жыццё было па-сапраўднаму цікавым і насычаным.

**С. ЯРМАК,**
**камсорг групы Б-11 біялагічнага факультэта.**

# «БУДЗЕ ШЧАСЛІВЫМ ГОРАД»



Мільёнам чытачоў у нашай краіне і далёка за яе межамі вядома імя выдатнага савецкага пісьменніка, аўтара гісторыка-палітычных раманаў, паэта, нарысіста і публіцыста Ільі Рыгоравіча Эрэнбурга.

За гады Вялікай Айчыннай вайны Эрэнбург напісаў некалькі соцень артыкулаў, якія друкавалі цэнтральныя і франтавыя газеты, замежныя выдавецтвы, перадавалі па радыё. Сотні артыкулаў — гэта сотні дарог вайны, па якіх прайшоў пісьменнік у якасці карэспандэнта «Красной звезды».

Восенню 1943 года Канстанцін Сіманаў і Ілья Эрэнбург былі ў дзеючай арміі пад Гомелем. 27 лістапада 1943 года ў газеце «Красная звезда» быў надрукаваны артыкул І. Эрэнбурга «Гомель».

У ім і боль за цудоўны, а тады разбураны горад, і радасць за воінаў-вызваліцеляў, за наступаючую армію, якая, па словах І. Эрэнбурга, «узброена праўдай». «Гэта яна (праўда) ўзняла наш народ у самыя цяжкія мінуты. Яна прывяла нас у змучаны, закатаваны, але тройчы прыгожы Гомель. Яна ж павядзе нас далей да зямлі разбою. Мы не святкуем. Мы наступаем!!!».

Часці Чырвонай Арміі пайшлі далей на захад. У гамяльчан былі і радасць вызвалення, і гора, боль за родны горад, цяжкасці аднаўлення.

Праз год пасля вызвалення, 26 лістапада 1944 года, «Гомельская праўда» друкуе артыкул Эрэнбурга «Гомель будзе жыць».

З гневам і боллю пісьменнік успамінае спалены горад, трупы дзяцей, піша, што пазнае ў твар забойцаў Гомеля. Далей прывычны стыль Эрэнбурга-публіцыста змяняецца вершамі.

У гэтых вершах Эрэнбурга — гнеў і разам з тым надзея, што ні адзін са злачынцаў не пазбегне пакарання. «...Мы яшчэ раз клянёмся: мы не забудзем Гомеля!.. Мы іх знойдзем на краю света, забойцаў Гомеля!.. Яны не думалі, што на беразе Сожа іх чакае пачатак расплаты!».

Свой артыкул пісьменнік заканчвае верай у сённяшніх герояў Гомеля: «Мы адновім Гомель — горад-прыгажун на беразе шырокага Сожа. Мы адновім яго сады і дамы, мы дапаможам залячыць душэўныя раны людзей, якія пражылі два гады ў чумным свеце фашызму... Набліжаецца к канцу гарачая пара салдата. Пачынаецца пара будаўнікоў, землябробаў, пісьменнікаў, настаўнікаў, пара аднаўлення. Гомель хоча жыць і Гомель будзе жыць».

І гамяльчане аднаўлялі свой родны горад, верылі ў яго шчаслівую будучыню. Яны расчышчалі завалы, будавалі дамы, пускалі заводы, фабрыкі і зноў чыталі Ілью Эрэнбурга, які 1 студзеня 1945 года пісаў у артыкуле «Пакуты і шчасце», надрукаваным у «Гомельскай праўдзе». «Мы гаворым цяпер: шчасце будзе вялікае, чалавечае шчасце, калі салдат, які вернецца з перамогай, абдыме жонку, возьме на рукі сына, паглядзіць на знаёмы з дзяцінства дом, дрэвы, убачыць родных людзей».

Шчасце прыйшло 9 мая 1945 года, каб затым стаць нашым сённяшнім днём.

Зброяй Эрэнбурга былі яго артыкулы. Але яны не толькі білі ворага, яны дапамагалі аднаўляць разбураныя гарады. Адзін з іх — наш цудоўны Гомель.

**А. ЯГОРАВА,**
**навуковы супрацоўнік абласнога краязнаўчага музея.**
**В. МАЮЧЫЙ,**
**студэнт 5 курса гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ.**

**НА ЗДЫМКУ: (злева направа) К. СІМАНАЎ, генерал П. БАТАЎ, І. ЭРЭНБУРГ на фронце пад Гомелем. 1943 год.**

# ФРАНТАВЫЯ ГІДРАГЕОЛАГІ

Мне і раней было вядома, што гідрагеолагі прымалі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне. Іх зброяй былі не аўтамат ці танк, а свідравальны станок і помпа. У хуткі час яны арганізоўвалі водазабеспячэнне палкоў і дывізій, а таксама асобных участкаў франтоў. Але іх значэнне ўяўлялася абстрактным, не звязаным з асобнымі людзьмі. І вось у 1982 г. мне трапіўся артыкул члена-карэспандэнта АН УССР А. Е. Бабінца «Этапы і асноўныя напрамкі развіцця гідрагеалогіі пасля першага гідрагеалагічнага з'езда», у якім роля франтавых гідрагеолагаў ацэнена вельмі высока. Абапіраючыся на гэты артыкул, я паспрабую закрануць тэму «Гідрагеолагі на вайне».

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны многія гідрагеолагі ўліліся ў рады абаронцаў Радзімы і пачалі ажыццяўляць аператыўныя пошукі і разведку чыстай вады для злучэнняў дзеючай арміі. Франтавыя ваенна-геалагічныя атрады фарміраваліся галоўным чынам з гідрагеолагаў і інжынераў-геолагаў. Яны ствараліся трэстам Спецыяльнага геалагічнага картавання «Спецгеа» Камітэта па справах геалогіі пры Савеце Міністраў СССР пры ўдзеле Штаба інжынерных войск Чырвонай Арміі. Трэстам «Спецгеа» кіраваў доктар геолага-мінералагічных навук гідрагеолаг Г. П. Сінягін. Многія гідрагеолагі і атрады атрымалі ўдзячнасць ад камандавання франтоў і начальніка інжынерных войск Чырвонай Арміі. Амаль усе франтавыя гідрагеолагі ўдастоены высокіх урадавых узнагарод. У іх ліку — К. І. Антоненка, А. Е. Бабінец, Б. Х. Рустамаў, П. Ф. Надзеждзін.

З іншых крыніц — ваенных мемуараў — вядома, якія самадданыя намаганні прыклалі гідрагеолагі для арганізацыі водазабеспячэння гераічных абаронцаў і насельніцтва Адэсы ў перыяд яе блакады фашысцкімі войскамі. Пасля жорсткіх баёў немцы захапілі помпавую станцыю, якая падавала ваду ў горад чарнаморцаў. Выйсце было знойдзена. У кароткі тэрмін былі ўключаны помпы на артэзіянскіх свідравінах некалькіх прадпрыемстваў, але вады не хапала і яе нарміравалі. Гідрагеолагі прасвідравалі дадаткова некалькі свідравін і тым самым аблегчылі становішча савецкіх войск, што абаранялі Адэсу.

**М. ЖУРАВЕЛЬ,**
**загадчык кафедры гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі, дацэнт.**

# ШАНУЙ КУЛЬТУРУ

Яшчэ на зары Савецкай улады У. І. Ленін неаднаразова падкрэсліваў, што неабходна ашчадна адносіцца да культурнай спадчыны народа, творча яе выкарыстоўваць. Камуністычная партыя і Савецкі ўрад заўсёды ўдзялялі вялікую ўвагу ахове помнікаў гісторыі і культуры, іх выкарыстанню ў выхаваўчай рабоце.

XXVI з'езд КПСС, вызначаючы задачы далейшага камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне, дакладна сфармуляваў напрамкі ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай дзейнасці партыі. «Трэба дабівацца, — указваецца ў Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXVI з'езду партыі,— каб яе змест стаў больш актуальным, а формы адпавядалі сучасным запатрабаванням і патрэбам савецкіх людзей». Кіруючыся праграмнымі рашэннямі партыйнага з'езда, пастановамі ЦК КПСС па ідэалагічных пытаннях, за апошнія гады ў нашым універсітэце, як і ў вобласці ўвогуле, узмацнілася ўвага да прапаганды гісторыі помнікаў рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.

Адной з важнейшых і эфектыўных форм вывучэння і прапаганды культурна-гістарычнай спадчыны з'яўляюцца народныя універсітэты ведаў аб помніках гісторыі і культуры. У 1978 г. на базе гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ быў адкрыты такі ж універсітэт.

Ствараючы народны універсітэт ведаў аб помніках гісторыі і культуры, мы зыходзілі з таго, што нашы выпускнікі будуць у асноўным працаваць у сельскіх школах. Педагагічную працу яны, як правіла, сумяшчаюць з лектарскай, з'яўляюцца экскурсаводамі, ствараюць народныя музеі, дапамагаюць партыйным арганізацыям у ажыццяўленні мерапрыемстваў па ахове і выкарыстанню помнікаў гісторыі і культуры ў патрыятычным, ідэйна-маральным, эстэтычным і інтэрнацыянальным выхаванні насельніцтва, павышэнні яго адукацыйнага і культурнага ўзроўню.

Савет народнага універсітэта, якім кіруе ветэран Вялікай Айчыннай вайны, заслужаны настаўнік БССР П. А. Дуброўскі, сваю асноўную задачу бачыць ва ўзбраенні студэнтаў ведамі ў галіне культурна-гістарычнай спадчыны савецкага народа, у азнаямленні іх з навейшымі дасягненнямі марксісцка-ленінскай навукі ў справе вывучэння і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры.

Наш народны універсітэт працуе па вучэбна-тэматычнаму плану, зацверджанаму кафедрай гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі і прэзідыумам абласнога савета па ахове помнікаў гісторыі і культуры. Ён складзены такім чынам, што не толькі задавальняе пазнаваўчую цікаўнасць слухачоў, але і выконвае ідэйна-выхаваўчую ролю, арганічна ўключае ў сябе праблемы сучаснага светапогляду, цесна ўвязвае вучобу, самаадукацыю і рашэнне практычных задач слухачоў.

Увесь вучэбны працэс у народным універсітэце праходзіць на аснове глыбокага вывучэння слухачамі твораў заснавальнікаў марксізму-ленінізму аб ідэалогіі і культуры, рашэнняў XXVI з'езда КПСС і іншых важнейшых дакументаў і пастаноў партыі і ўрада па ідэалагічных пытаннях, Законаў СССР і БССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры» ў справе камуністычнага выхавання. Тэматыка лекцый — самая разнастайная: ад старажытных археалагічных знаходак да помнікаў баявой і працоўнай славы. Заняткі праводзяцца па дзве гадзіны два разы ў месяц.

Народны універсітэт ажыццявіў ужо чатыры выпускі. Цяпер у ім займаецца 75 слухачоў — студэнтаў першага і другога курсаў. Ёсць пастаянны састаў кваліфікаваных лектараў. Разам з выкладчыкамі перад слухачамі часта выступаюць Герой Савецкага Саюза В. П. Мухін, члены Гомельскага абласнога савета аховы помнікаў гісторыі і культуры А. Ф. Скрабін і П. С. Стракалаў, навуковыя супрацоўнікі абласнога краязнаўчага музея І. А. Смыкоўскі, М. Н. Огай і інш.

Аб высокім ідэйна-тэарэтычным узроўні заняткаў у нашым народным універсітэце гаварылі ўдзельнікі рэспубліканскага семінара рэктараў народных універсітэтаў па вывучэнню помнікаў гісторыі і культуры, якія знаёміліся з работай ГДУ. Эфектыўнасць яго работы заключаецца ў тым, што яна праводзіцца ў цеснай сувязі з вучэбна-выхаваўчай і навукова-даследчай работай студэнтаў. Заняткі дапамагаюць ім у выкананні курсавых і дыпломных даследаванняў, у праходжэнні вучэбных і вытворчых практык. Штогод больш 20 курсавых работ студэнтаў прысвячаецца культурна-гістарычнай спадчыне. Так, слухачы народнага універсітэта, студэнты другога курса гістарычнага аддзялення, напісалі і паспяхова абаранілі курсавыя работы па тэмах: «Прыкладное мастацтва Беларусі ў X—XIII ст.» (А. Панамарова); «Рамяство плямён паўднёва-ўсходняй часткі Беларусі ў раннім жалезным веку» (Н. Бурунова). «Вывучэнне архітэктуры полацкага Сафійскага сабора ў 50—80 гг. XX ст.» (Е. Барсукова); «Мемарыяльны ком-

